Л.К.Валасюк, *дацэнт*

# АКТЫВІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ У КЛАСЕ СПЕЦІНСТРУМЕНТА

Адна з галоўных задач ВНУ — навучыць студэнта самастойна творча працаваць. Авалоданне глыбокімі прафесіянальнымі ведамі прадугледжвае развіццё ў навучэнцаў даследчых навыкаў, здольнасці арыентавацца ў выбраных накірунках, што забяспечвае высокі ўзровень пазнавальнай дзейнасці. Гэта магчыма толькі пры індывідуальным падыходзе да кожнага студэнта.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Асновай вучэбнага працэсу па спецыялізацыі з'яўляюцца арганічнае спалучэнне і ўзаемасувязь індывідуальных і самастойных заняткаў студэнтаў. Індывідуальныя заняткі сталі традыцыйнай формай навучання, дзе ступень асэнсавання матэрыялу залежыць ад навукова-метадычнай падрыхтоўкі выкладчыка, актыўнасці і ведаў студэнта. Але гэтыя веды могуць быць глыбокімі і асэнсаванымі ў тым выпадку, калі студэнт сістэматычна працуе самастойна.

Каб самастойная работа была эфектыўнай, навучэнцу неабходна дапамога педагога, асабліва яна патрэбна студэнту, які рыхтуецца стаць музыкантам.

Мастацтва ігры на любым музычным інструменце заснавана на адзінстве мастацкага вобраза і тэхнічнага майстэрства, якое дазваляе музыканту данесці да слухача тое, што ён хоча сказаць сваім выкананнем. Пастаяннае ўдасканаленне тэхнічнага майстэрства дапамагае студэнту пашыраць свае магчымасці ва ўвасабленні мастацкіх вобразаў.

Слухаючы музычны твор, мы не ўспрымаем асобна яго мелодыю, рытм, тэмбр, гармонію, мы ўспрымаем музыку цэласна, абагульняючы ў вобразе асобныя сродкі яго ўвасаблення. Успрыманне заўсёды звязана з асэнсаваннем і ўсведамленнем таго, што чалавек бачыць, чуе, адчувае.

Калі мы ўспрымаем музычны твор і з першых жа тактаў адзначаем, што гэта Шапэн, а гэта — Бетховен, то тым самым адносім пачутае да пэўнай эпохі, пэўнага стылявога накірунку. Больш глыбокаму разуменню асаблівасцей выкарыстання сродкаў музычнай выразнасці дапамагае параўнанне выражэння аднаго і таго ж настрою ў розных кампазітараў. Такія параўнанні прыводзяць да разумення стылю, які ў розныя эпохі быў розным. Параўнанне кантрастных па настроі твораў садзейнічае разуменню спецыфікі кожнага сродку музычнай выразнасці.



БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Такі накірунак работы са студэнтам патрабуе засваення прынцыпаў творчага пераўтварэння і адлюстравання рэчаіснасці ў гуках музыкі, пашырэння ведаў студэнта аб музычных стылях, жанрах, формах.

Вялікае значэнне для развіцця музычнай памяці мае папярэдні аналіз твора. Думка аб значэнні свядомай мысліцельнай дзейнасці ў працэсе запамінання музычнага твора з'яўляецца галоўнай ва ўсіх сучасных метадычных рэкамендацыях.

Дзеянні па запамінанні інфармацыі спачатку фарміруюцца як дзеянні пазнавальныя, потым яны выкарыстоўваюцца як спосабы адвольнага запамінання. Запамінанне музычнага твора па вядомай трыядзе "бачу — чую — іграю" і прынцыпы работы над музычным творам па формуле І.Гофмана, якія выкарыстоўваюцца ў рабоце са студэнтамі, могуць быць рэкамендаваны навучэнцам для самастойных заняткаў па спецыяльнасці. У аснову іх кладуцца розныя спосабы работы над творам.

1. Работа з тэкстам твора без інструмента. На гэтым этапе працэс азнаямлення з творам ажыццяўляецца на аснове ўважлівага вывучэння нотнага тэксту і ўяўлення гучання з дапамогай унутранага слыху. Пры гэтым выяўляюцца: 1) галоўны настрой твора; 2) сродкі, з дапамогай якіх ён выражаецца; 3) асаблівасці развіцця мастацкага вобраза; 4) галоўная ідэя твора; 5) пазіцыя аўтара; 6) сваё, асабістае разуменне сэнсу аналізуемага твора.

2. Работа з тэкстам твора за інструментам. Пасля першага азнаямлення пачынаецца дэталёвая прапрацоўка твора. "Добра запамінаецца толькі тое, што добра зразумета", — вось залатое правіла дыдактыкі. Для таго, каб працэс запамінання праходзіў эфектыўна, неабходна ўключаць у работу дзейнасць усіх аналізатараў музыканта. Чым вышэй пачуццёвая, сенсорная і

БІБЛІЯТЭКА БГУКІ

разумовая актыўнасць у працэсе развучвання твора, тым хутчэй ён вывучаецца напамяць.

3. Работа над творам без тэксту (ігра напамяць). У працэсе выканання твора адбываецца далейшае замацаванне яго ў памяці слыхавой, рухальнай, лагічнай. Вялікую дапамогу ў запамінанні аказваюць і асацыяцыі, да якіх звяртаецца выканаўца для знаходжання большай выразнасці выканання.

Прыцягненне паэтычных асацыяцый для актывізацыі эстэтычнага пачуцця — даўняя традыцыя ў музычным выкананні, якая пастаянна павінна быць у полі зроку выкладчыка на занятках са студэнтам.

Паэтычныя вобразы, карціны, асацыяцыі, узятыя як з жыцця, так і з твораў мастацтва, добра актывізуюцца пры пастаноўцы адпаведных задач. Спалучэнне пачутых гукаў з пазамузычнымі вобразамі і ўяўленнямі, маючымі падабенства з паэтычнай асновай, абуджае эмацыянальную памяць, пра якую гавораць, што яна бывае мацней памяці розуму.

Вывучаны твор мае патрэбу ў рэгулярным паўтарэнні для замацавання ў памяці. У кожнае паўтарэнне неабходна ўносіць хоць які-небудзь элемент навізны або ў адчуваннях, або ў асацыяцыях, або ў тэхнічных прыёмах. Для гэтага трэба развіваць у навучэнцаў уменне самастойна, без дапамогі выкладчыка прымяняць музычна-тэарэтычныя веды на практыцы. Разнастайнасць уражанняў і выконваемых дзеянняў у працэсе паўтарэння музычнага матэрыялу дапамагае ўтрымліваць увагу на працягу доўгага часу.

4. Работа без інструмента і без нот. Гэта найбольш цяжкі спосаб работы над творам. Тым не менш, чаргуючы мысленнае прайграванне твора без інструмента з рэальнай ігрой на інструменце, студэнт можа дабіцца трывалага запамінання твора.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

З псіхалогіі нам вядома, што мастацкае мысленне — гэта мысленне вобразамі, якія абапіраюцца на канкрэтныя ўяўленні. У сучаснай музычнай псіхалогіі мастацкі вобраз музычнага твора разглядаецца як адзінства трох пачаткаў — матэрыяльнага, духоўнага і лагічнага.

Для развіцця і самаразвіцця студэнта вельмі істотнымі з'яўляюцца разуменне і правільная арганізацыя ўсіх бакоў музычнага творчага працэсу, пачынаючы ад яго задумы і канчаючы канкрэтным увасабленнем у выкананні. Таму мысленне студэнта-музыканта неабходна сканцэнтраваць галоўным чынам на наступных аспектах дзейнасці.

1. Стварэнне вобразнага строю твора — магчымых асацыяцый, настрою і думак, якія яны выклікаюць.

2. Абдумванне матэрыяльнай тканіны твора — логікі развіцця думкі ў гарманічнай пабудове, асаблівасцях мелодыі, рытме, фактуры, дынаміцы, агогіцы, формаўтварэнні.

3. Пошук найбольш эфектыўных шляхоў, спосабаў і сродкаў увасаблення на інструменце думак і пачуццяў. "Я дасягнуў таго, чаго хацеў," — вось завяршальная кропка, кажучы словамі Г.Г.Нейгаўза, у працэсе выканання музыкі.

На думку многіх музыкантаў-педагогаў, у сучасным музычным навучанні даволі часта пераважае трэнаж прафесіянальна-ігравых здольнасцей вучняў. Недастатковасць ведаў музыкантаў пра музыку дае падставу меркаваць аб прафесіянальным абмежаванні музыкантаў-нструменталістаў. Звычайна іх веды не выходзяць за вузкае кола непасрэднай спецыялізацыі. Неабходнасць вывучыць на працягу вучэбнага года некалькі твораў па зададзенай праграме не пакідае часу на такія віды патрэбнай для музыканта дзейнасці, як падбор па слыху, транспанаванне, чытанне з ліста, ігра ў ансамблі, імправізацыя.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Пашырэнне музычнага і агульнага інтэлектуальнага кругагляду павінна быць пастаянным клопатам як выкладчыка, так і маладога музыканта. І тут мы зноў звернемся да аўтарытэту Нейгаўза, які сцвярджаў, што "навучанне, асабліва ў мастацтве, ёсць адзін з відаў пазнання жыцця і свету і ўздзеяння на яго".

Штуршком для ўключэння працэсаў мыслення ў творчы працэс часцей за ўсё аказваецца праблемная сітуацыя. У вучэбнай дзейнасці праблемная сітуацыя выяўляецца ў неадпаведнасці паміж наяўнымі ведамі і новымі патрабаваннямі. Тыя веды, якія студэнту неабходна засвоіць, займаюць месца невядомага.

Выконваючы шэраг вучэбных дзеянняў, навучэнец здабывае неабходныя веды ў працэсе самастойнага мыслення.

Для развіцця навыкаў мыслення ў працэсе ўспрымання музыкі студэнту рэкамендуецца:

— выявіць у творы галоўнае інтанацыйнае зерне;

— вызначыць на слых стылявы накірунак музычнага твора;

— знайсці фрагмент музыкі пэўнага кампазітара ў радзе іншых (напрыклад, знайсці ўрывак з музыкай Чайкоўскага ў радзе ўрыўкаў з яго музыкай, з музыкай Шапэна, Бетховена, Рахманінава);

— выявіць асаблівасці выканальніцкага стылю пры інтэрпрэтацыі рознымі музыкантамі аднаго і таго ж твора;

— вызначыць на слых гарманічныя паслядоўнасці;

— падабраць да музычнага сачынення творы літаратуры і жывапісу ў адпаведнасці з яго вобразным строем.

Для развіцця навыкаў мыслення ў працэсе выканання студэнту трэба:

— параўняць выканальніцкія планы музычнага твора ў іх розных рэдакцыях;

— знайсці ў музычным творы вядучыя інтанацыі і апорныя пункты, па якіх развіваецца музычная думка;

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

— скласці некалькі выканальніцкіх планаў аднаго і таго ж музычнага твора;

— выканаць твор з рознымі ўяўляемымі аркестроўкамі;

— выканаць адзін і той жа твор у розных уяўляемых колеравых адценнях (у сінім, чырвоным, фіялетавым).

Пры выкананні праблемных заданняў студэнтам карысна параўнаць варыянты рашэнняў аднаго і таго ж задання. Дыскусіі і абмеркаванні ўдакладняюць і развіваюць працэсы мыслення, прымушаюць навучэнцаў дакладна фармуляваць свае пазіцыі і рабіць неабходныя вывады.

Музычны твор у рэальным гучанні існуе ў незлічонай колькасці разнастайных выканальніцкіх трактовак. Стымуляванне педагогам варыятыўнага падыходу да выконваемага твора, пабудовы некалькіх выканальніцкіх планаў аднаго і таго ж твора вядзе да фарміравання ў студэнта багатага творчага ўяўлення, павышае мастацкую выразнасць ігры.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ